# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Майстар. Ёлка. Нюня. Арлан. Ткач. Карал. Макака. Накал. Карась. Какаду. Тапчан. Бар. Рада. Атаман. Рак. Ларок. Арахіс. Таз. **Па вертыкалі:** Манака. Свята. Арфа. Лерка. Юнак. Кліка. Чмель. Рана. Арык. Асада. Каралі. Ананас. Абарот. Урук. Трата. Пчала. Ака.

**Склаў**
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.29 | 16.57 | 7.28 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.39 | 7.13 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.46 | 7.27 |
| Гомель — | 9.07 | 16.52 | 7.45 |
| Гродна — | 9.42 | 17.13 | 7.31 |
| Брэст — | 9.34 | 17.22 | 7.48 |

## Месяц

*Маладзік 28 снежня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*
*К. Меланіі, Сільвестра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 31 СНЕЖНЯ

**У краіне**

**1854** год — нарадзіўся Пётр Уладзіміравіч Уладзіміраў, расійскі філолаг-славіст, гісторык літаратуры, доктар рускай славеснасці. Адзін з заснавальнікаў беларусазнаўства. Уладзіміраў выявіў новыя дакументы пра Скарыну, даволі поўна аднавіў яго біяграфію, прааналізаваў выданні, адзначыў іх асаблівасці, наватарства і значэнне для беларускай і ўсходнеславянскай культур.



**1904** год — нарадзіўся Іван Дзянісавіч Варвашэня, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. У 1941—1943 гадах — сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б і адначасова ў жніўні 1942-га — красавіку 1943-га — сакратар Слуцкага падпольнага міжрайкама КП(б)Б, камісар партызанскага злучэння Слуцкай зоны. З 1944 года — сакратар Мінскага абкама, з 1950-га — першы сакратар Мінскага гаркама КП(б)Б.

**1909** год — нарадзіўся Юрый Давыдавіч Бяльзацкі, беларускі кампазітар, дырыжор, піяніст. Працаваў у Дзяржаўным джаз-аркестры Беларусі, быў канцэртмайстрам Белдзяржэстрады, мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага радыё.

**1929** год — нарадзілася Марыя Ціханаўна Чайка, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі раслін, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук. Распрацавала метадычныя прыёмы, якія выкарыстоўваюцца ў селекцыі і пры стварэнні экалагічна бяспечных тэхналогій, у прыватнасці інкрустацыі насення найважнейшых збожжавых культур, якія вырошчваюцца ў Беларусі.

**1959** год — на Магілёўскім заводзе штучнага валакна атрымана першае штапельнае валакно.

**У свеце**

**1514** год — нарадзіўся Андрэас Везалій, сярэднявечны навуковец. Заснавальнік сучаснай практычнай анатоміі. Адзін з першых стаў вывучаць чалавечы арганізм шляхамускрыцця. Аўтар працы «Аб уладкаванні чалавечага цела».



**1869** год — нарадзіўся Анры Эміль Бенуа Матыс, французскі мастак і скульптар, лідар плыні фавістаў. Вядомы сваімі пошукамі ў перадачы эмоцый праз колер і форму. Сярод найбольш вядомых палотнаў — «Танец», «Музыка», «Жанчына ў зялёным капелюшы», «Радасць быцця».

**1917** год — дэкрэтам савецкага ўрада прызнана незалежнасць Фінляндыі.

**1999** год — Барыс Ельцын выступіў днём па тэлебачанні з заявай, што ён пакідае пасаду Прэзідэнта Расіі. Выканаўцам абавязкаў кіраўніка краіны стаў Уладзімір Пуцін. У гэты ж дзень Злучаныя Штаты перадалі Панаме кіраванне Панамскім каналам і тэрыторыямі ваенных баз, якія з пачатку XX стагоддзя займалі амерыканскія войскі.

## УСМІХНЕМСЯ

— Вы адмыслова да нас прыйшлі ўладкоўвацца на работу ў снежні, каб бясплатна пажэрці на карпаратыве?..

**Дзяўчатам і жанчынам. Мужык перад Новым годам палахлівы і асцярожны, як лань. У адносіны ўступае неахвотна, каб падарунак не дарыць.**

— Мама, мама, ёлка гарыць!
— Сынок, не гарыць, а зззяе.
— Мама, мама, шторы зззяюць!




**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 3 студзеня 2020 года.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў несуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4278.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12